БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня
Адміністрацыя зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць пасыланые рукапісы і карэспонданцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.
Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй 50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 14. Менск. Аўторак 9 красавіка 1918 г. Год

Менск 9/IV.

Кожын дзень прыносіць нам радасныя весткі. За апошні час, калі, здавалася, Менск адрэзан ад усяе правінцыі, па гарадох і весках Беларусі развіваліся нашые організацыі, прыдушаные большэвікамі і паўставалі бяз ліку новые горны беларускай працы. І калі да нас з'яўляюцца аттуль з мейсцаў прэдстаўнікі гэтых організацый, яны нам апаведаюць з якой хціваcьцю яны лавілі усякіе весткі, што йшлі з Менску. Выпадковая газэта, якінібудзь падарожны—прыносілі у глыбіню правінцыі весткі, што у Менску беларусы працуюць, намагаючыся стварыць дзержаўную організацыю Беларусі. А мы, Менскіе беларусы, з ахвотаю кожын раз бачым, што аткуль бы ні прыехаў беларус—у яго такіе самые думкі аб беларускай справі, як і у Менскіх працаўнікоў. Нідаўна мы даведаліся, што Віленская, Магілеўская, Барысаўская рады вынеслі рэзолюцыі яб нізалежнасьці, а Гомельская з усіх сіл дабіваецца, каб земля Радзімічоў была аб'еднана з усей Беларусю. У адзін тахт бьюцца беларускіе сэрцы: і у Менску, і у Вільні, і у Магілеві, і—нават мы верым, у Віцебску і Смаленску.

З радасьцяй можым сказаць: усе беларусы, калі яны праўдзівые беларусы,—усе яны—аднэй мыслі.

Мы пэўны, што як толькі з'явіцца магчымасьць вольнаго пераезду па нашай старане, дык мы зможым пабачыць на свае вочы па усім краі зялёную рунь беларускай працы. Усюдых праўда ішчэ параскіданы руіны расійскай дзержаўнасьці—і нават цэнтралізму усякіе акружные суды, што ішчэ твораць суд на Беларусі імям расійскаго ураду (німаведама толькі катораго—Раманава, ці Керэнскаго, ці Леніна), земствы у якіх сідзяць прэдстаунікі «белорускаго крестьянства» прыехаўшые з Рязані у «Бѣлоруссію» за месяц да выбароў, эс-эры, што займаюцца руссіфікацыей беларусоў і шмат іншых пэражыткаў цёмнай мінуўшчыны. Але перарастае іх беларуская рунь і ктому часу, як прыдзе пара красаваць збожжу, сярод буйных каласоў беларускаго жыта згіне і памяць аб усходніх прыблудах— насільніках. Тады мы пабачым, што беларуская дзержаўнасць ня тольки пажадана, але праз аб'еднанне беларускіх сілаў ужо створана мазольнай працай сыноў Беларусі, раскіданых па ўсіх яе шырокіх абшарах.

Ніхай жа істнуючые беларускіе цэнтры сьмялей і галасьней прамаўляюць ат імяні свайго народу. Ніхай ні трывожацца тым, што аслаблі іх зьвязі с правінцыей.

Яны куюць долю свайго народу, працуючы над адбудовай беларускай дзержаўнасьці і—покуль ня зыйдуць з гэтай гістарычнай дарогі, могуць быць пэўнымі, што беларускі народ пойдзе за імі усьлед.

Родная мова.

Родная мацярынская мова—фундамант жыцця кожнаго народу. Бяз мовы—німа народнасьці, німа самаістнасьці.

Народы—Лазары ішлі цярністай пуцявінай да нацыянальнай адбудовы перш за усе барацьбой за прызнанне іх мовы.

Чэхі, славакі, славенцы, харваты, украінцы, літоуцы, мовы усіх гэтых народау лічыліся грубымі, нездатнымі да грамадзкога жыцця.

І беларуская мова лічылася і лічыцца такой самай—хамскай—нездатнай нат для малітвы Богу.

І Песьняры нашаго адраджэння няупынна высока нясуць штандар грамадзкіх праў беларушчыны. Ішчэ Бурачок казаў; што «мова наша не хамская яна такая ж як французская, нямецкая і іншыя». Наказ дзеда—жывы перад намі: «шануйце сваю мову, каб не памерлі». Цяпер перад беларусамі аткрыліся шырокіе гарызонты: куецца дзержаўнасьць, а родная мова—у тым самым загоне. Прышлі новыя маладыя беларускія сілы, выкінутыя на паверх расійскай рэвалюцыяй і яны пачалі цікавіцца беларушчынай і спрыяць ей, а нават знайшлі яе практычна патрэбнай, але... але толькі пакуль што на «тульскі фасон», бо беларушчыну «в популяризаціи в русской литературѣ», і калі прышлося пісаць «граматы», дый прыказы і наказы, дык «беларусы» пакуль што пякуць іх на «державном россійск. языкѣ». Нават сама вестка, што мова беларуская прызнаецца гасударственай і абавязковай—пісана была так сама па расійску, а робячы скарбоначны збор, просяць афяраваць «на культурно—просвѣтительныя бѣлорусскія организаціи».

Сьвятая ідылія! Сам Салановіч са Шмітам пусьцілі б слінкі і заплакалі «од умиленія».

«Барані нас Бог ад прыяцеляу, а з ворагамі—справімся»—разумная прыказка. Варта яе асабліва цяпер памятаваць беларусам.

Аткінем гэтых прыяцеляу, бо пакуль мова не стане дарагой штодзеннай, буднішнай беларускай мовай—німа інтэлігенцыі, німа нацыянальнай сілы, бо мова гэта альфа і амэга нацыянальнаго жыцця—яе клек.

Паулюк з Гродны.

Курсы беларусазнаўства.

Адчэняные курсы беларусазнаўства маюць мэтаю даць слухачом тое, чаго янэ ні могуць вычытаць с кніг дзеля таго, што кніг а беларушчыні альбо саўсём німа, альбо янэ вельмі рэдкія, такія рэдкія, што на увесь Менск есьць можа толькі адна кніга, як «Літоўскі Статут» і ўласнік яе трымае яе, як вялікі скарб і нікаму ні дае карыстацца ею.

Курсы рахуюць глаўным чынам на вучняў і інтэлігенцыю беларускую, каторая ціпер у значнуй часьці бяз мейсца.

Што могуць даць курсы? Дагэтуль мы вучылі шмат усяго нам саўсім ні патрэбнаго, толькі ні вучылі свайго бацькаўскаго. Мы вучыліся забываць і зневажаць мову бацькоў і іх самых з іх звычаямі. Цяпер нам канечна патрэбна пазнаёміцца с сваею моваю ў гістарычнай пэрспэкціві. Нам трэба знаць звычаі нашаго народу, яго песьні і казкі, яго песьняроў, нашую старую літэратуру, на якой пісаліся старые акты і законы. Культура нашая, гісторыя і геаграфія нам выкладаліся ў школах, дык у саўсём ніпрыхільным дзеля нас сьвеці.

Курсы, ведама, ні дадуць ніякіх праў, ні якой паперкі на атрыманне, нічога ні робячы, смашнаго кавалка хлеба.

Тым маладым ягомосьцям, каторые чакаюць унівэрсытэту, ні як мейсца дзеля працы, а дзеля набыцця прывілеяў, і ні хочуць дзеля гэтаго хадзіць на курсы, трэба сказаць, што унівэрсытэт у нас калі і будзе, дык ён ні будзе даваць ніякіх праў, каб усякі здольны чалавэке, самавук, напрыклад, меў магчымасьць сваімі здольнасьцямі, у развіцьці якіх ён ні патрэбаваў грамадзянскіх страт, прынесці карысьць свайму краю.

Апроч таго, ніведама, як хутка будзе у нас унівэрсытэт. Нашые вучні, калі і будуць вучыцца у чужых унівэрсытэтах, дык мала могуць пазнаёміцца з беларушчынай. Толькі тут—у сэрцы Беларусі—трэба браць усё, што толькі можна.

Моладзь, у якой уся нашая надзея, павінна канечна хадзіць на гэтые курсы, калі яна ні хоча прыстаць да лагеру маскоўскаго, альбо польскаго.

А. Д.

Весткі з Расіі.

— У «Voss. Ztg.» пішуць с Стокгольму: Вялікарускі бальшэвіцкі урад як цэласьць—ужо ні істнуе. Масква і Пецербург прэдстаўляюць два адзін ад другога нізалежных урадовых цэнтры. У той час калі Ленін у Маскве, стоючы на чале чыста бальшэвіцкай ўлады, гатоў пагадзіцца на мір з Украінай і адстаўленне Фінлядзіі, Троцкі у Пецербургу трымаецца на іншай лініі.

Гэта ён выклікаў з Фінляндзіі паслоў Францыі і Італіі і Французскую ваенную міссію, каторую Ленін праз колькі тыднямі перад гэтым змусіў выехаць с паўночнай Расіі. За помаччу іх мае стварыцца новая армія для змагання за інтарэсы Расіі процiў нямеччыны.

Троцкі стараецца прыцягнуць да сябе і кадэтаў. С таго часу як урад перанесс[ся] у Маскву, Мілюкоў ужо 2 раз[ы] быў у Пецербургу і меў тай[ные] ные пераговоры с Троцкім, адм. Вэрдэрэўскім і ангельскі[м] паслом. З другога боку Троц[кі] стараецца прыцягнуць да сяб[е] правых с.-р., с правадыро[м] каторых, Чэрновым, вядзе пе[ра]гаворы. Правые с.-р. най[больш] заўзятшые працiўнікі Бярэсь[ць]цейскаго міру. З усяго відаць, што Троцкі хоча аб'еднаць ус[е] працiўныя Бярэсьцейскому міру элемэнты, каб зваліўшы Ленінскі урад, утварыць з дапамогаю Лёндану і Парыжу новую армію для звароту на[зад] бальтыйскіх правінцыяў і Фінляндзіі.

— У Пецербургу усе ахв[ота]пэры і генералы штабу, каторые самахвотна ні уступі[лі] у новую армію, атрымалі пры[]каз явіцца. Ім будзя даручана рэорганізацыя рэволюцыйна[й] арміі пад контролям «савету».

Агульныя весткі.

— Падтрымованы дагэтул французамі абстрэл Лаона ця[]пер узмацаваўся. За гэта немцы ні пэрястаюць абстрэліваць Рэйм.

— У гутарцэ з ангельскімі французскімі коррэспондэнтамі ген. Фош сказаў, што ус[ё] ідзе добра і што непріяцель пачынаючы ад 30 сакавік[а] быў стрыманы. «Сягоння ма[]ем 4 красавіка—сказаў Фош —і значыць ясна, што насту[]пленне непрыяцеля ні удало[]ся».

— Ллойд-Джорж вярнуўся [у] Лендан пасьля паездкі н[а] фронт, каторы аглядаў раза[м] с Клемансо. Яны былі у фэль[д]маршала Гэйга і генерала[ў] Пэтэна, Фоша, Пэршынга [і] Блісса.

— Клемансо перэканаўся [у] главнай кватэры Фоша, шт[о] другая часьць бітвы над Сом[]май запатрабуя значнейшаг[о] часу. Урадовыя адчоты стара[]юцца зменшыць значэнне но[]вых стратаў французскай т[э]рыторыі.

— Даносяць з Бэрну ад 6 г. м., што італьянская граніца зно[ў] зачынілася.

— Швайцарскае т. аг. паве[]дамляе, што у г. м. пасьля пау[]дня у Рыме адбылося пасяд[]зэнне Рады міністраў, на як[ім] абгаварывалося цяпераш[нее]

іжнароднае палажэнне, сытуцыя на італьянскім фронце і ялікае уздаражанне харчовых радуктау.

Паміж італьянскімі мужамі тану пануе уражэнне, што аурусьнікі адносяцца да Італіі і з дастатэчнай шчырасьцю. Становішча Італіі робіцца ніважлівым. Міністр харчовых прау, остра зазначыу, што ад аурусьнікау трэба дабіцца эунаго забэзпячэння прывозу.

— Балгарскае т. аг. паведамяе з Букарэшту, што балгарскі дэлегат гэн.-май. Тотілов забажау увольнення з румынскаго войска усіх ахвіцэрау салдатау родам з Добруджы. З Яссау паведамляюць, што 12 і 15 румынскія дівызыі ужо дэмобілізованы. 45000 дэмабілізованых салдатау і 1000 ахвіцэрау ужо вярнуліся у Валахію.

На беларускім шляху.

У камісіі Народнай Прасьветы. 7-го красавіка у Камісіі Народнай Прасвеці пры Гарадскай Думі пастаноўлено рэгістраваць усе вучэбныя установы і культурна прасьветн. товарыства абавязково, а прыватных вучыцяляў—па іх добрай згодзі. У рэгістрацыі адмаўляецца тым установам і таварыствам, на чале каторых стаяць людзі ні з дабрай рэпутацыяй. Аднастыя, аб заправілах каторых ведама нічога ні добраго, ні кепскаго—рэгіструюцца.

Бежанскія школы, бышыя В. З. С., маючыя найбольшую лічбу вучняў беларусаў, п. Бадунова прапанавала пярадаць у Беларускую Падкамісію.

Пастанавілі нацыональны састаў вучняў абследаваць праз камісіі (зноў казка пра белаго бычка), пры гэтым старшыня заявіў, што калі у гэтых школах хоць трошкі будзе нібеларусаў, дых іх ні можа узяць беларуская падкамісія, а імі будзе кіраваць агульная камісія. Дзеля таго, што усе школы Менска с выкладовай мовай расейскай былі передадзены па прапазыцыі п. Смоліча тымчасаво у Вялікарускую Падкамісію, п. Даніловіч прасіў пярэдаць гэтыя школы так сама у агульную камісію. Але разгляданё гэтаго пытаня адлажылі да другога разу. Робіцца камісіі, каб дасьвядчыць, што тутака німа беларусаў. Гэта тоя самое, як калі б мы хацелі праканаць каго, што каля нас німа паветра.

Расійская дэмакрацыя цягне далей царскую палітыку і награджае тых, хто стаіць проціў народных жымчэнняў. Так вучыцелі, каторые пярэшкаджалі абследаваць нацыанальны састаў і зрабілі скандал Даніловічу,—павышаны. Грынькова назначана заправуляць школаю дзявочаю, а Сакалоўскі выбраны у агульную камісію членам.

І гэта робіць меншасьць расійскай дэмакратыі, адрэзаная ад центру. Што будзя, калі па уходзі немцаў іх нахжые сюды процьма? Задушаць?

Трушанка.

У Менску чакаюць хаўтуроў. Ад даўжэйшаго часу хворая старушка канае. Канае і ні можа... сканаць. Бог, відаць, карае яе за старые грашкі і гэткую празначыў пакуту. Мучыцца старушка—канае. А радня? радня—як радня: адны—цешуцца, другіе— плачуць. А радні гэтай шмат: 70.000 душ. Ні мела старушка у жыцці сваім памяркунку: адным пры ёй жылося сытна, цёпла—ой як цёпла—тые цяпер плачуць; з другіх—па дзьве скуры дзерла старушка—тые цяпер скачуць.

Канае старушка, а радня круціцца каля яе і шушукаецца: куды ж мы, сіроткі, галоўку сваю прытулім?

Кінуліся сіроткі пад апеку да Гарадзкой Управы, але Управа і знаць іх ні хоча.

Канае старушка—канае Менская Мешчанская Управа і... сканаць ні можэ, а мо і ні хоча... А даўно пара!

* * *

За хаўтурамі—хаўтуры. Канаюць «земсаюзы, земгоры, согоры», і т. п. Канаюць і ні могуць ... сканаць. Лейб-мэдык усіх гэтых «земгусараў і согусарыняў» п. Злобін робіць ім падскурные успрыскі—тольکі ні с камфоры,—а з удалых ліквідацый астаўшагося багацця на Беларусі.

Але гэта і ні дзіва. Пан Злобін сам відны беларускі дзеяч з Разанскай губэрні.

І завіхаецца п. Злобін каля нашаго дабра—як Разанскі шмель каля беларускаго вульля.

Што п. Злобін вельмі рухавы і энэргічны працоўнік—гэта мы ўсе ахвотна прызнаем угледаючыся хаця б на тыя земсаюзныя лазні, акія ён тут набудаваў. Але будаваць «рускія бані»—гэта адно, а будаваць Беларусь—гэта другое саўсім, пане Злобін, другое...

* * *

Бываюць хаўтуры, бываюць і радзіны. Радзілося ў нас Губэрнскае прысутства. Але гэта дзіцятка прышло на сьвет калекай: даўней у губэрнскім прысуствi было тры аддзелы: судовы, выкупна-чыншавы і распарадзіцельны, ну і разумеецца было тры начальнікі і цэлы штат служачых; цяпер жэ радзіўся толькі адзін аддзел—судовы, дык куды ж ўсім дзецца? Са служачымі—ні бяда:, ніхай сабе пазабаўляюцца, пагуляюць на сьвежым паветры—на тое сёлята ажно два Вялікадні. ну а паном начальнікам ні да гульняў, калі пэнсіі трэба браць; дык пры цяперашніх галодных пайках нават начальнікі так пацянелі, што ўсе тры стоўпіліся у адным аддзелі.

Што тут дзіцянё—адно, а мамкі—тры, то і я ведаю, але хто каго тут будте карміць—далібог, ні разьбяру.

* * *

Ад прыбытку—галава ні баліць. Так кажуць. Але найчасьцей бывае так, што калі прыбытак аднаму, та другому убытак і наадварот.

Для распсаткі з 280-цю рабочымі службы руху Л. Р. ж. д. было прырыхтавано 34.000 рублеў—«керэнкамі» і «думскімі». Служачые прасілі, каб начальство ні фатыгавалося меняць грошы, а плаціло ім хоць і тысячарублёвымі паперкамі па групам. Тымчасам, як прышло да распчаты, стаўся цуд: замест «керэнак»—пасыпаліся... маркі. На гэтым цудзе служачые мелі убытку, як кажуць, каля 3.000 рублеў, ды іщчэ за размен с кожнаго вылічылі па 10 кап.—180×10=28 рубл.

Ну, а хто ж меў прыбытак??

* * *

Дзіўные нераз бываюць прыбыткі і убыткі.

Не так даўно у купецкім клюбі адзін с тутэйшых дактароў выйграў у карты 100.000 рубл. Прыбытак ня кепскі. Гэты самы доктар у тым самым клюбі ускорасьці прайграў у карты 100.000 рубл. І убытак нішто.

А вось пытаньне: чы ні выпісаць бы з Расіі якога колячы, капіталам Крывашэіна, бальшэвіка, каб ён заглянуў: што такі за клюб, дзе бываюць гэткіе прыбыткі і убыткі?

І другое: сколькі такі доктар атправіў і іщчэ адправе людзей на той сьвет?

* * *

Калі ні на той сьвет, то на вуліцу хочуць выгнаць 200 арэндароў, якіе мелі ніасьцярожнасьць пабудавацца у Менску на чужой зямлі, а ні маюць чым заплаціць чыншу.

Выціснуць чынш у беднаты цяперашнім часам, разумеецца, вельмі трудна. Ледзь—ледзь узяўся за гэту справу адзін адвакат.

Адзін—але, відаць, добры.

* * *

Усё добра—што добра канчаецца.

Харчовы аддзел Л. Р. ж. д. выдаў на пакупкі сваяму агенту 16.000 рубл. Праз нейкі час агент заявіў, што у яго гэтые грошы укралі. Далі знаць у міліцыю. Праз некольки дзён пасля дапросу той самы агент вярнуў усе 16.000, сказаўшы, што грошы ен дастаў ад сваей радні.

Эх, каб мне такую радню: дзядзьку, ці хоць якую цётку—ні пісаў бы я ў «Беларускі Шлях».

Камар.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

„Епархіальныя Вѣдомости“, якія спыніліся на час, як толькі наладзіцца почта Менск-Мар'іна Горка—Бабруйск, зноу пачнуць выходзіць. Замест даунейшых о. Панова і Скрынчэнкі, цяпер рэдактарам будзе рэктар сэмінарыі о. Язвіцкі, каторы ставіць мэтай для сваей газэты заняцца толькі сваімі духоунымі справамі і прыналегчы на цэркоуна-прыходскія школы.

Хлебные спэкулянты пачалі наганяць і без таго вялікую цану на хлеб. Скупляючы хлеб у хлебапекарнях па 1 р. 50 к., яны прадаюць самі по 1 р. 70—1 р. 80 к. за фунт. Аб гэтым былі ужо заявы у міліцыю. Трэба спадзевацца, што пры цяперашніх часах гэткіе спэкулянты апынуцца там, дзе ім належа быць

Нацыянальныя бежанскія арганізацыі пачалі рэгістрацыю бежанцау, якіе маюць ехаць на свае мейсцы у першы чарод. Разам з гэтым арганізацыі маюць пярэгаварыць з нямецкім начальствам аб часе выязду зарэгістрованых.

Фармальную ачыстку места—немцамі назначана скончыць да 15-го красавіка. Гэта тым больш патрэбна, што дзе-нядзе чутны ужо выпадкі тыфусу.

Земсаюзные вэксалі,—выданные перад акупацией служачым у земскім саюзе з надпісамі: «с казны по возобновленіі нормальных функцій государственнаго казначейства».. і т. д.—с кажным днем трацяць сваю вертасьць.

Дайшло да таго, што такія «обязательства» на 2000 рубл. прадаюцца па 150 р. за штуку.

Тое самае робіцца цяперь і з аблігацыямі «займа свабоды»: за сотку—даюць 25 р.

Не зявіліся іщчэ у нашым Менску п'яукі.

Новы прыказ гэтымі днямі мае выдаць нямецкае начальство. Павэдлуг яго усе землявласьнікі, арэндары, хутаране і селяне маюць права пакінуць сабе харчау і зерня толькі як на сваю канечную патрэбу: на яду сабе і на насенне.

Курсы беларусознауства.

Сягоньні—9 красавіка заместа лекцыі А. Смоліча будзе *лекцыя Язэпа Варонкі: „Гісторыя беларускаго нацыянальнаго руху“.*

Пачатак а 6-ай гадз.

Упраулеине Л.-Р. ж. д. с 1-го красавіка мае уволіць са службы усіх вольнонаемных служачых, як упрауленскіх, так і дарожных штатным служачым дазволяна браць двухмесячные отпускі.

Весткі с краю.

З Вільні.

Дабрачынныя арганізацыі у Вільні атрымалі цыркуляр начальніка месца аб выкарыстанні свабодных пляцау і агародау на патрэбы народных сталовых. Значныя патрэбавання народных і дзяцінных кухняу на варыва, картофлю і агародніну змушаюць нямецкую уладу да адпаведных крокау, каб гэтые кухні маглі для уласнаго спажытку засадзіць патрэбную лічбу варыва і картофлі.

Дзеля гэтай мэты трэба забязпечыць сабе патрэбныя вольныя пляцы і агароды. Заявы аб гэтым трэба падаваць у III аддзел начальніка места, адкуль яны пакіруюцца у гаспадарскі аддзел. Гаспадарскі аддзел, калі толькі будзе ведамым, што гэта пойдзя на патрэбу кухняу адпусьціць, па ніскай цане насенне і расаду.

Нідастатак работніц, які адчуваўся у апошнія гады, будзя адсунуты III аддзелам начальніка места каторы даставіць кабечую рабочую сілу.

Адзначыць трэба пры гэтым, што у 1917 годзе варыва у граніцах места, Вільні ні рэквізавалася.

Так сама і збор пліонау ні абцяжау выдаткау кухняу. Падобныя распараджэння маюць быць і на гэты год.

Прозьбы аб отпуску пляцау, агародау, насення і расады, разам с паведамленням аб патрэбнай лічбе работніц трэба падаваць начальніку места да 15 красавіка.

„Dz. Wil“.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтва **Т-во «Заранка»**.

БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ ПРЭДСТАУНІЦТВО

МЕНСК, Серпухоуская № 12.

ПРЭЗЫДІУМ КАМІТЭТУ

прыймае што дня ад 12 да 2 гадзіны апрыч сьвят.

Беларускае выдавецкае таварыство у Менску „ЗАРАНКА“.

Цякучы рахунак у Менскім Т-ве Узаемнаго Крэдыту № 1798. Праўленне: Менск, Серпухоўская вул. 12.

Т-во маець за мэту выдауніцтво кніг для пачатковай школы, для студэнтау і вучняу выжшых клясау сярэдніх школау, а так сама для шырокае публікі. **Спагадаючых гэтаму просяць запісывацца у сябры Т-ва.** Поунапраунымі сябрамі лічуцца асобы унесшыя 100 рубл. Яны маюць права пастанауляючаго голасу, і атказваюць за справы Т-ва. Ніпоунапрауныя сябры уносяць ні меней 15 рубл., карыстаюць правам дарадчаго голасу і атказываюць за справы т-ва «ЗАРАНКА» толькі сваім паем.

Старшыня **П. Аексюк** (юрыста).
Скарбнік **К. Цвірка-Гадыцкі.** (інжынэр).
Пісар **А. Уласоў.** (публіцыста).

Друкарня Я. А. Грынблята.